PolotskSU



УДК 398.33:582(=161.3)(476.5)“18/20”

# СПЕЦЫФІКА ВЫКАРЫСТАННЯ ДЗІКАРОСЛЫХ РАСЛІН БЕЛАРУСАМІ ПАДЗВІННЯ Ў АБРАДАХ ВЯСНОВАГА ЦЫКЛУ К. XIX – ПАЧ. XXI СТСТ.

*Я.С. КНУРЭВА*
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі

*Дзікарослыя расліны здаўна выконвалі важную ролю ў каляндарнай абраднасці беларусаў. Ўяўленні аб іх знаходзілі сваё ўвасабленне ў шматлікіх рытуалах і абрадах усіх цыклаў гадавога кола, у тым ліку і вясновага. У артыкуле аналізуецца спецыфіка выкарыстання дзікарослых раслін беларусамі Падзвіння ў вясновай каляндарнай абраднасці канца XIX – пач. XXI ст. На падставе матэрыялаў палявых даследаванняў аўтара і пісьмовых крыніц характарызуюцца лакальныя народныя уяўленніаб раслінах уабрадах дадзенага цыклу.Вылучаюцца асноўныя напрамкі рытуальнага выкарыстання дзікарослых раслін на Падзвінні ў межах святаўВербніцы, Юр’я і Троіцы.*

У параўнанні з пяццю іншымі гісторыка-этнаграфічнымі рэгіёнамі Беларусі Падзвінне адрозніваецца сваёй унікальнасцю, якая праяўляецца ў розных аспектах традыцыйнай культуры, у тым ліку і ў традыцыйных уяўленнях. Гаворачы пра фактары, якія ўплывалі на складванне народных уяўленняў беларусаў Падзвіння аб прадстаўніках мясцовай флоры, у першую чаргу варта ўзгадаць важнейшы прыродна-кліматычны фактар. Тэрыторыя рэгіёну характарызуецца панаваннем больш суровага клімату ў параўнанні з паўднёвымі абласцямі Беларусі, а таксама наяўнасцю дзярнова-падзолістых сугліністых глебаў. З гэтага і вынікае відавая спецыфіка расліннага свету паўночнай Беларусі, што праяўляецца ў пераважэ іглічных парод дрэваў над лісцянымі ў межах тэрыторыі Падзвіння. Асаблівасці, характэрныя для культуры беларусаў дадзенага рэгіёна, абумоўлены і яго геаграфічным становішчам: наяўнасцю мяжы са Смаленшчынай і Пскоўшчынай на ўсходзе і латвійскімі землямі на захадзе, што забяспечвае адкрытасць тэрыторыі да міжэтнічных этнакультурных кантактаў.

Пасля зімы як перыяду доўгага “сну” прыроды, вясна ў традыцыйным светаўспрыняцці беларусаў успрымалася не толькі як наступны заканамерны этап гадавога кола, але ў першую “абуджэнне” прыродных сіл і іх станаўленне на новы лад. Фактычна, амаль уся каляндарная абрадавая дзейнасць, што мела месца ў беларускай традыцыі ў веснавы перыяд, была накіравана на хуткі надыход вясны і паспяховы пачатак новага цыклу сельскагаспадарчых прац, якія ў выніку мусілі прынесці багаты ўраджай, што для селяніна з’яўлялася самым важным.

Вясновы цыкл календара адкрывае свята *Дабравешчання,* на якое прыпадае пачатак актыўнага прабуджэння расліннасці ад зімовага сну. М. Нікіфароўскім у канцы XIX ст. на Віцебскім Падзвінні было зафіксавана павер’е пра *арэхавы куст,* які цвіце ўначы толькі на Дабравешчанне. Існавала ўяўленне пра тое, што арэх прыносіць шчасце і надзяляе чалавека здольнасцю знаходзіць скарбы ў купальскую ноч таму, хто здолее сарваць першую

PolotskSU



кветку з куста [17, с. 128]. Як сведчаць этнаграфічныя дадзеныя, у сучаснасці звесткі аб падобных уяўленнях, на жаль, не сустракаюцца.

Вялікі комплекс традыцыйных уяўленняў беларусаў аб раслінным свеце звязаны з *Вербнай Нядзеляй (Вербніца),* якая папярэднічала Вялікадню. Асноўным элементам велікоднай абраднасці беларусаў Падзвіння ў кантэксце агульнабеларускай традыцыі выступала *вярба,* што ва ўсходніх славян адпавядала біблейскай пальмавай галіне. Украінскі даследчык К. Ю. Рахно лічыць, што выкарыстанне галінак вербы – з’ява больш старажытная за хрысціянства, адпаведна рытуальна-магічны характар дрэва замацаваўся яшчэ ў дахрысціянскія часы [22, с. 307]. Вярбу прадстаўнікі традыцыйнай культуры надзялялі апатрапейнай функцыяй, што зыходзіла з народных уяўленняў пра яе надзвычайную моц, якая значна павялічвалася пасля асвячэння расліны ў храме. Па народных павер’ях, нячыстая сіла, якая з Вадохрышча і да Вербніцы сядзіць на вярбе, звальвалася ў ваду пасля таго, як галінкі асвячаюць у цэрквах [16].

К. Рахно выдзяляе дзве формы выкарыстання славянамі вярбы ў апатрапейнай перспектыве – доўгачасовую і сітуацыйную [22, с. 306]. Доўгачасовая форма заключалася ў выкарыстанні вярбы ў якасці апатрапея ад рознай небяспекі на працягу ўсяго года. Да свята сяляне рыхтаваліся загадзя – вярбу ставілі ў ваду, каб яна распусцілася, затым да яе дадавалі ядловец “ад усякага зглазу”, часам упрыгожвалі кампазіцыю папяровымі кветкамі ці стужкамі [24, с. 88]. Асвячалі галіны ў царкве, ўторкнуўшы ў іх свечку [9, л. 30]. Згодна ўяўленням жыхароў Полаччыны, асвячэнне вярбы напрамую мела сувязь з будучым ураджаем, як бы праграмавала яго: “Вярбу свецяць, каб жыта ішло такое высокае і чыстае, як вярба” [24, с. 88].

Трэба адзначыць, што галінкі вярбы сяляне выкарыстоўвалі практычна ва ўсіх сферах жыцця: для абароны хаты, гаспадаркі і саміх гаспадароў ад негатыўнага ўздзеяння. З гэтай мэтай асвечанымі галінкамі тройчы сцябалі па спіне дамачадцаў, што, на іх погляд, павінна было спрыяць здароўю. “Біццё” часта суправаджалася прыгаворамі. Месцамі традыцыя бытуе і зараз. У традыцыйных прыгаворах Падзвіння фігуруюць шматлікія азначэнні вярбы. Да прыкладу, у Докшыцкім і Глыбоцкім раёнах у прыгаворах сваёй спецыфікай вылучаліся ўяўленні пра г. зв. “белую” і “красную” вярбу (“…ёсць жа красненькая вербінка, а ёсць белая”): “Верба бела б’е за дзела, верба красна б’е напрасна!” [8]. У Гарадоцкім раёне сустракаем азначэнне і “сіняй” вярбы: “Верба крёст – сякецъ да слёз, верба бела сякецъ за дзела, верба сіня б’ецъ па спіне” [1, л. 88].

Прымячальна, што вербныя прыгаворы сярод каталікоў Падзвіння адрозніваліся значным рэлігійным ўплывам ў параўнанні з праваслаўнымі, дзе архаічныя элементы прыгавораў захаваліся ў большай ступені: “Верба б’е не заб’е, за тыдзень Вялікдзень, за сем ноц Вельканоц” [2, л. 54].

Асвечаныя галіны дрэва, паводле агульнабеларускай традыцыі, амаль паўсюдна ўторквалі за іконы і за вуглы хаты або ў страху хаты “каб не знесла” (Полацкі, Докшыцкі, Глыбоцкі, Шумілінскі і інш. раёны) [3, л. 21]. На Браслаўшчыне свянцоная вярба лічылася надзейным сродкам ад пажару [1]. Ставілі галінкі і на вакно, дзе вярба таксама выконвала функцыю грамаадвода: “Каб пярун не даў і град не пабіў” [9, л. 10]. Беларусы-каталікі

PolotskSU



Падзвіння здольнасць адводзіць грымоты вярбе прадпісвалі ў значна ў меншай ступені, чым праваслаўныя: "Ну гэта хто як, па каждаму. Такога стандарта не было" [4, л. 54].

Сітуацыйная форма выкарыстання вярбы праяўлялася ў яе ўжыванні ў небяспечнай сітуацыі – лячэнні хвароб дамачадцаў і жывёлы шляхам абкурвання і г.д. Для лячэння на Падзвінні выкарыстоўвалі свянцоную вярбу і разам з *ядлоўцам* – заварвалі і давалі піць хвораму [25, с. 88].

Традыцыя выкарыстання вярбы на Вербніцу ў памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння з'яўляецца характэрнай яскравай рысай рэгіёну. У канцы XIX – пачатку XX ст., побач з аналагічнай заходнепалескай традыцыяй, у Полацкім і Віцебскім паветах М. Нікіфароўскім была адзначана традыцыя наведваць на Вербніцу могілкі і ўторкваць у іх галінкі вярбы. Рытуальныя дзеянні, якімі суправаджалася наведванне, ўключалі ў сябе сцябанне магілы вярбой (3 разы) і вуснае вітанне з нябожчыкамі [17, с. 16–17]. На сённяшні дзень традыцыя сустракаецца у асобных частках Падзвіння. У Докшыцкім раёне зафіксавана адзначэнне Вербных Дзядоў перад Вербніцай, хаця могілкі ў гэты дзень не наведваюць [10, с. 48]. У цэлым у большай частцы Падзвіння традыцыя на сённяшні дзень, на жаль, практычна не фіксуецца.

Выкарыстанне вербы ў гаспадарчай магіі сярод традыцыйнага насельніцтва Падзвіння, ў агульнабеларускім кантэксце звязвалася, як правіла, з прыпісваннем ёй значных прадуцыравальных уласцівасцей, здольных паўплываць на будучы ўраджай. Як вынік, вярба шырока выкарыстоўвалася насельніцтвам ў магічных практыках, звязаных з гаспадарчай дзейнасцю.

*На Вялікдзень* вярба працягвала выковаць функцыю галоўнага абрадавага дрэва, упрыгожваючы велікодны стол селяніна. Найбольш часта вярба выкарыстоўвалася ў абрадзе першага выгана скаціны ў поле (на Падзвінні – "*запасванне*") на *св. Юр'я*. Правядзенне абраду першага выгана скаціны, на думку селяніна, павінна было гарантаваць яе бяспеку ад нападу дзікіх звяроў і садзейнічаць яе паспяховаму вяртанню дадому. Як правіла, абрад суправаджаўся спецыфічнымі загаворамі кшталту: "Верба-лёс, бі да слёз, верба б'е, я ня б'ю, сігай ў лес, у хіры лес, у хіры цёмны лес…" і г.д. [5, л. 7]. Вярбу на Падзвінні выкарыстоўвалі разам з яйкам як асноўным рытуальным прадметам, што павінна было забяспечыць дабрабыт пагалоўя ската і гаспадаркі на ўвесь сезон. На Глыбоччыне напярэдадні свята клалі яйка пад парог, выганяючы скаціну на пашу вярбой, а затым па вяртанні пакідалі галінкі ў хляве: "Вербіну ўзяць у рукі, а даўней хто стары і яйцо клалі пад парог… гэтай вербінай аж на пасту загоніш і прыносілі ў хлеў торкалі" [9, л. 17].

Спецыфічныя рысы правядзення абраду "запасвання" з ужываннем пэўных відаў дзікарослай расліннасці на Падзвінні вылучаюцца і ў межах самаго рэгіёна. У Міёрскім раёне, напрыклад, разам з вярбой выкарыстоўвалі і мінулагоднія *купальскія зёлкі*, якімі падкурвалі скаціну падчас правядзення абраду: "А тады хазяйка ззадзі нясецъ кацялочкі, там жару насыпана і святой травы" [25, с. 89]. У Пастаўскім раёне карова праходзіла цераз парог, у які папярэдне забівалі *асінавы кол*, што абараняла яе ад уздзеяння чараўнікоў, а ў Гарадоцкім раёне акрамя гэтага жывёлу сцябалі распараным *бярозавым* венікам і абсыпалі *макам.* На Полаччыне падчас выгану жывёлу абкурвалі вярбой і зёлкамі, а таксама *ядлоўцам і дзівасілам*: "Дзівасілам асобенна кладуць, гавораць, дванаццаць сіл у ім" [24, с. 104].

PolotskSU



Пасля запасвання вербную галіну, па традыцыі, прыносілі назад у хату або ў хлеў – такім чынам сімвалічна праграмавалі вяртанне жывёлы дадому і папярэджвалі выкарыстанне галіны ведзьмамі з мэтай нанесці шкоду. У М. Нікіфароўскага сустракаюцца звесткі аб падзвінскай традыцыі разламваць пасля вяртання з поля вербную галінку на столькі частак, колькі пасвілася жывёл у статку, пасля чаго гэтыя часткі кідалі ў хлеў (каб скаціна не ўцякала). Падобны рытуал у сваю чаргу быў зафіксаваны і П. Шэйнам на Гродзеншчыне і Берасцейшчыне: “Як первый раз выгоняеш скотыну, трэба пошчытаты, кулько штук там е, и тулько кусочков тэи вэрбы свячоной поломаты и кинуты ў хлиў – то будуць заходыты ў хлиў” [20, с. 133].

Паступова разам з разбурэннем калектыўных гаспадарак у сельскай мясцовасці значна скарачаецца пагалоўе ската ў насельніцтва, што не магло не паўплываць на традыцыю: “Раньшэ было скаціны многа. Вот скаціна хадзіла па лесе – і мы хадзілі разам, скаціна ламала дрэўцы якія, траўку шукала. Пасвілі. Стада было – пад сто кароў, па 50. Многа было. Усе мяста былі як пустыя, свабодныя. А цяпер ніхто не ходзіць, нікога нідзе няма – усе зарэсла. Ужо цяпер, еслі пайсці – я ўжо там нідзе не прайду” [8, л. 8]. На сучасным этапе адбываецца трансфармацыя народных уяўленняў у напрамку нівеліроўкі лакальнай спецыфікі выкарыстання дзікарослых раслін у абрадзе першага выгану ската (т.е. насельніцтва ў большасці выпадкаў ўзгадвае выключна пра ўжыванне вербнай галінкі).

Паказальнай для Падзвіння з’яўляецца традыцыя выкарыстання на Юр’я вярбы ў абрадах земляробчага цыклу, што былі накіраваны на забеспячэнне ўрадлівасці глебы на ўвесь бягучы год. Вярбу ўторквалі ў зямлю падчас ранішняга абыходу нівы: “На Юр’я вербіну гэту ў жыта становіш” (Глыбоцкі раён) [6, л. 21]. У Шумілінскім раёне рытуальнае выкарыстанне вярбы падобным чынам інфарматары тлумачылі тым, што дрэва нібыта перадае сваю “святасць” зямлі: “Як удзень ідуць на поле, і галінку гэту торкаюць у зямлю…каб зямля святая была” [9, л.15]. На думку А. Шлюбскага, дадзены абрад стымуляваў рост збажыны, што падцвярджаюць мясцовыя прыгаворы: “Жыта, расці, як вярба, высокае, чыстае расці” (Полацкі р-н) [12, с. 106]. Абрад, падобны да вышэйадзначанага, сустракаўся ў другой палове XIX ст. і ў іншых рэгіёнах. Так, на Панямонні – на св. Юр’я гаспадары абыходзілі свае палі і ўторквалі вярбу ў зямлю ад граду [14, с.173]. На Падзвінні і сёння вярбу асобныя ставяць у гародах “ад буры, ад усяго” [25, с. 107].

Разнастайнасцю вылучаюцца традыцыйныя ўяўленні беларусаў Падзвіння аб дзікарослых раслінах у межах свята *Троіцы* (на Падзвінні – *“Духа”, “Сёмуха”, “Зялёныя святкі”* і г.д.), якое звязана з перыядам біялагічнага росквіту расліннага свету. Асноўным атрыбутам траецкай абраднасці з’яўлялася шырокае выкарыстанне зеляніны маладых дрэваў. На тэрыторыі Беларусі сустракаюцца розныя абагульняючыя назвы троіцкай зеляніны – *май, троіца, клечаннё, дуб’ё* і г.д. [23, с. 17]. Траецкая абраднасць ўражвае багаццем рэгіянальных традыцый святкавання ў межах гісторыка-этнаграфічных абласцей, у тым ліку і на Падзвінні. Сустракаліся варыяцыі ў выкарыстанні розных відаў дзікарослай расліннасці, схемах іх прымянення і г.д, аднак падзвінская традыцыя ў найбольшай ступені звязвалася з выкарыстаннем *бярозавых галін*.

У параўнанні з іншымі рэгіёнамі краіны, на Падзвінні ў суботу за тыдзень да Троіцы з асаблівай урачыстасцю святкаваліся Траецкія Дзяды (перыядычна сустракаецца назва

PolotskSU



*Стаўроўскія Дзяды*) [13]. Зеляніна (“май”) ў гэты дзень шырока выкарыстоўвалася яшчэ на этапе падрыхтоўкі да наведвання могілак. Да прыкладу, у Расонскім і Гарадоцкім раёнах фарбавалі яйкі *бярозавым* лісцем, праз якое яны набывалі спецыфічны жоўты колер: “Яйкі красілі бярёзавым лістом ілі травой. Яны жоўценкія палучаюцца такія” [24, с. 110]. На Расоншчыне ў в. Янкавічы бярозай падчас наведвання хрысцілі магілку, а затым ўторквалі галіну ў яе. У Верхнядвінскім раёне жанчыны прыбіралі могілкі бярозавымі венікамі [10, с. 51].

На Пскоўшчыне захаваўся своеасаблівы памінальны звычай: пры наведванні могілак іх “апахвалі” (абмяталі) пучком бярозавых галін і кветак – верылі, што гэта прыносіць радасць памерлым [11, с. 447]. У беларусаў Себежчыны, якая ў мінулым уваходзіла ў склад Беларусі, у сваю чаргу, зафіксавана традыцыя “сцябаць” магілы бярозавым веццем [10, с. 51]. Дадзеная традыцыя, як вынікае з вышэйадзначанага, ўзнікла ў беларускага насельніцтва як вынік этнакультурнага ўплыву. У рэшычшы адзначанага цікавым фактам з’яўляецца і бытаванне традыцыі выкарыстання зеляніны на Троіцу ў памінальнай абраднасці сельскіх жыхароў Паўночна-Заходняй Расіі ў канцы 90-х гг. На Троіцу насельніцтва выкарыстоўвала бярозавыя галіны падчас наведвання могілак: імі абкладвалі стол, стулы. Па павер’ях мясцовага насельніцтва, “покойники приходят – чтобы садились на эти березки” [25,с. 86].

Як і паўсюль на Беларусі, на Падзвінні ў Траецкую суботу зелянінай ўпрыгожвалі сялянскія двары звонку і ўнутры. Падлогу хаты засцілалі *аерам (яварам)*, якому у траецкай абраднасці адзводзілася асобнае месца: “Ваер во ў мяне вісіць. Дык ён пахнець, такі пахнючы, мы яго ў хаце астаўлялі, ну, гэта ўсё падбіралі і палілі” [9, л. 49]. У асобных мясцінах зрэзаны аер кідалі прама на парозе хаты ў якасці абярэга ад нячыстай сілы [8, л. 28]. Уяўленні пра апатрапейныя функцыі аера мелі пад сабой рацыянальную аснову, заснаваную на яго біялагічных ўласцівасцях адпужваць насякомых. Да прыкладу, на Троіцу аерам пасыпалі падлогу, бо “аір не дает росту блохам” [18, с. 65].

Выкарыстанне розных відаў раслін характарызавалася пэўнай разнастайнасцю ўнутры самога рэгіёна. У паўночных і заходніх раёнах Падзвіння асноўным рытуальным дрэвам з’яўлалася бяроза, з якой рабілі вянок – бярозавы “май”: “На Троіцу стаўлюць май, і пад паталок вешаюць. І стаіць гэты май ад Троіцы і да Купалы” [22, л. 5]. Бярозавыя вянкі надзяляліся лекавымі і апатрапейнымі функцыямі і выкарыстоўваліся ў якасці абярэга. Галіны бярозы клалі за іконы, уторквалі ў патэнцыйна небяспечныя месцы ў хаце (століь, дзверы, вокны і г.д.). У Полацкім раёне май ставілі і на ростанях, каля крыжа [24, с. 111]. У паўднева-ўсходняй частцы рэгіёна “май” ставілі з галін розных дрэў: акрамя бярозы выкарыстоўвалі *дуб, клён, ліпу, рабіну* і г.д. Да прыкладу, у Лёзненскім раёне выкарыстоўваліся адразу ўсё вышэйпералічаныя дрэвы: “Абізацельна ставілі бярёзу, клён, ліпу, у хаці пад балькі торкалі веткі кожнага дзереўца. Сякуць бярозы бальшыя і дзелаюць такія як вароты” [24, с. 111]. У гэтым жа раёне фігуравала павер’е: калі ў Чысты чацвер зрабіць ванну з “маем” і выкупацца ў ёй, тады “цэлы год чысты чалавек не балеець ніякей балезню” [24, с. 111]. Падобныя ўяўленні адлюстроўваюць павер’е аб лекавых уласцівасцях “мая”, якія былі ўласцівыя беларусам і ў іншых рэгіёнах.

Пад уплывам хрысціянства агульнараспаўсюджаным з’яўляўся звычай асвячаць “май” ў царкве, у тым ліку і на Падзвінні. У Докшыцкім і Шумілінскім раёнах існавала традыцыя асвя-

PolotskSU



чаць зеляніну на Дзевятнік (прысвятак перад Троіцай) [7, л. 42]. “Май” клалі за іконы, выкарыстоўвалі з ахоўнай мэтай: уторквалі ў патэнцыйна небяспечныя месцы ў хаце – у столь, дзверы, вокны і г.д. У Полацкім раёне “май” ставілі і на ростанях, каля крыжа [24, с. 111].

У традыцыйным светапоглядзе беларусаў троіцкая зяляніна выконвала і медыятыўную функцыю, пра што сведчыць існаванне сістэмы прадказання надвор’я па ім. Напрыклад, дзякуючы раслінам маглі прадказваць вынік сенакоса: “Калі лісце завяне за адзін дзень – будзе сенакос  харошы, а калі на Духа дождж, то і сена будзіць гнілое” [24, с. 101]. У Бярэзінскім раёне хуткае высыханне зеляніны прадказвала сухое лета і наадварот [24, с. 168]. Медыятыўная функцыя раслін на Троіцу адлюстраваная і ў абрадзе “завівання бярозы”, які фіксуецца ў асобных рэгіёнах Беларусі. Абрад “завівання бярозы” на Падзвінні быў прадстаўлены завіваннем вянкоў дзяўчатамі і траецкімі варожбамі. Гэтым Падзвінне адрозніваецца ад памежнай тэрыторыі Смаленшчыны, для якой характэрны больш поўны комплекс элементаў абраду: ўбіранне бярозы ў стужкі, хаджэнне з ёй па сялу і г.д. [12, с. 79].

Медыятыўная функцыя дзікарослых раслін яскрава прасочвалася ў бытаванні на Беларусі, ў тым ліку і на Падзвінні, комплекса траецкіх варожбаў, звязаных з імі. Як і ў іншых мясцінах Беларусі, траецкія варожбы на Падзвінні мелі на мэце прадказанне будучыні і засноўваліся на апазіцыях “замужжа – адзінота” і “жыццё – смерць”, адлюстроўваючы найбольш хвалюючыя пытанні чалавека. У Дубровенскім раёне дзяўчаты завівалі бярозавыя вянкі і пакідалі іх на тыдзень, а пасля глядзелі на вынік: “Чый вяночак праз нядзелю вясёлы – будзе жыць. А бывае і ссохнець – то тая дзяўчына памрэць” [24, с. 112]. На Пастаўшчыне вянок вешалі на дрэва і прымячалі, хто з хлопцаў зніме яго – той і будзе мужам.У Лёзненскім і Шаркаўшчынскім раёнах пускалі вянкі на ваду і глядзелі, ў чый бок яны прыплывуць [24, с. 112].

Шырока выкарыстоўвалася траецкая зяляніна і ў гаспадарчай магіі. Так, у Лёзненскім раёне перад Троіцай завівалі вянкі на рогі каровам з *бярозы, ліпы і клёна* [24, с. 113]. Па павер’ях, гэта забяспечвала жывёле здароўе і вялікія надоі [20, с. 43]. Магічны сэнс абрадаў траецкага цыклу з выкарыстаннем зеляніны заключаўся ў забеспячэнні дабрабыту сям’і, гаспадаркі і багатага ўраджаю на ўвесь будучы год.

Вывады. Даследаванне паказала, што дзікарослыя расліны шырока выкарыстоўваліся ў вясновым цыкле каляндарнай абраднасці беларусаў Падзвіння ў канцы XIX – пачатку XXI ст.

З канца XIX ст. у вясновым цыкле  календара сістэма народных ведаў беларусаў Падзвіння пра дзікарослыя расліны, як і ў астатніх рэгіёнах, найбольш актыўна функцыянавала ў межах святаў Дабравешчання, Вербніцы, Юр’я і Троіцы. Пачынаючы з др. пал. XX ст. шэраг народных уяўленняў пра расліны пастунова знікае разам з носьбітамі традыцыі. Так, паступова знікаюць уяўленні пра арэхавы спарыш на Дабравешчанне. Лакальная традыцыя адзначэння Вербных Дзядоў на Падзвінні фіксуецца на сенняшні дзень толькі ў памяці насельніцтва. Трансфармацыя адбылася і ў традыцыях выкарыстання дзікарослай раслінасці ў юр’еўскай абраднасці. Так, абрад першага абыходу зямлі з вярбой на Юр’я, які яшчэ ў к. XIX ст. бытаваў у шэрагу рэгіёнаў Беларусі, сёння фіксуецца ў адзінкавых выпадках толькі на тэрыторыі Падзвіння. На сучасным этапе народныя уяўленні беларусаў

PolotskSU



Падзвіння пра дзікарослыя расліны трансфармуюцца ў напрамку нівеліроўкі лакальнай спецыфікі выкарыстання расліннасці ў абрадзе першага выгану ската. З усёй разнастайнасці ўжываемых раслін насельніцтва ў большасці выпадках ўзгадвае толькі вярбу). Гэты працэс з'яўляецца вынікам значнага скарачэння пагалоўя ската ў гаспадароў сельскай мясцовасці.

Паводле агульнабеларускай традыцыі, на Падзвінні найбольшай разнастайнасцю і багаццем характарызуецца сістэма традыцыйных ведаў пра дзікарослыя расліны, прымеркаваная да святаў Вербніцы і Троіцы. Гэта было звязана з перыядам біялагічнага росквіту расліннага свету ў дадзены перыяд. Пад уплывам хрысціянскай рэлігійнай традыцыі адбываецца актыўны зварот і далучэнне да яе народных уяўленняў, у сувязі з чым актыўна бытуе традыцыя асвячэння вярбы на Вербніцу. З др. пал. ХХ ст. традыцыя ўпрыгожвання вербнай галінкі жывымі кветкамі і раслінамі трансфармуецца і набывае новыя сучасныя элементы, што праяўляецца ў выкарыстанні ў якасці дадаткаў да вярбы кветак са штучных матэрыялаў прамысловага вырабу. Шыроакараспаўсюджанай на Падзвінні традыцыяй па-ранейшаму застаецца ўпрыгожванне на Троіцу пераважна бярозавымі галінамі знешняй і ўнутранай прасторы жылля.

## ЛІТАРАТУРА


1. Архіў гісторыка-філалагічнага факультэта Полацкага Дзяржаўнага Універсітэта (АГФФПДУ). – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 1.
2. АГФФПДУ. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 5.
3. АГФФПДУ. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 2. Сш. 2.
4. АГФФПДУ. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 2. Сш. 3.
5. АГФФПДУ. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 2. Сш. 4.
6. АГФФПДУ. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 2. Сш. 6.
7. АГФФПДУ. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 2. Сш. 7.
8. Архив Института искусствоведения, этнографии и фольклора им. К.Крапивы (АИИЭФ). – Ф. 6. Оп. 14. Д. 214.
9. АГФФПДУ. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 2. Сш. 1.
10. Аўсейчык, У.Я. Памінальная абраднасць беларусаў Падзвіння ў веснавы перыяд (па этнаграфічных матэрыялах XIX – пачатку XXI стагоддзя) / У.Я. Аўсейчык // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. – 2014. – № 9. – С. 46–55.
11. Беларусы / І.У. Чаквін [і інш.] ; рэдкал. І.У.Чаквін / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Бел. навука, 2007. – Т. 10. Славянскія этнакультурныя традыцыі. – 514 с.
12. Беларусы / Г.А. Барташэвіч [і інш.] ; рэдкал. В.М. Бялявіна [і інш.] / НАН Беларусі ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Бел. навука, 2004. – Т. 7. Вусная паэтычная творчасць. – 586 с.
13. Добровольский, В.Н. Смоленский этнографический сборник / В.Н. Добровольский. – М. : тип. А.В. Васильева, 1903. – Ч. IV. – 720 с.

PolotskSU




14. Крачковский, Ю. Быт западно-русского селянина / Ю. Крачковский // Полоцк, 1872. – 212 с.
15. Малоха, М. Елка / М. Малоха, С. Санько // Беларуская міфалогія : энцыклапед. слоўнік. – Мінск : Беларусь, 2004. – С. 159–160.
16. Малоха, М. Вярба / М. Малоха, Л. Салавей // Беларуская міфалогія : энцыклапед. слоўнік. – Мінск : Беларусь, 2004. – С. 106.
17. Никифоровский, Н.Я. Освященные предметы и отношение к ним простонародья Витебской Белоруссии / Н.Я. Никифоровский // Витебск : Типо-Литограф. насл. М. Б. Неймана, 1903. – 26 с.
18. Нясвіжскага краю напеў векавы: народная духоўная культура Нясвіжчыны / пад. агул. рэд. В.С. Новак. – Нясвіж : Нясвіжская ўзбуйненная друкарня імя С. Буднага, 2012. – 272 с.
19. Плотникова, А.А. Первый выгон скота в Полесье / А.А. Плотникова // Славянский и балканский фольклор. Этнолингвистическое изучение Полесья. – М. : Индрик, 1995. – С. 108–142.
20. Полацкі этнаграфічны зборнік / склад. А.У. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – Ч. 1. – 148 с.
21. Рахно, К.Ю. Обереговые функции освящённой вербы / К.Ю. Рахно // SALIXSONORA. – М. : Институт славяноведения РАН, 2011. – С. 305–319.
22. Сысоў, У.М. З крыніц спрадвечных / У.М. Сысоў. – Мінск : Вышэйшая школа, 1997. – 415 с.
23. Толстой, Н.И. Троицкая зелень / Н.И. Толстой // Славянский и балканский фольклор. Духовная культура Полесья на общеславянском фоне. – М. : Наука, 1986. – С. 14–18.
24. Традыцыйная мастацкая культура беларуса : у 6 т. / рэдкал.:Т.Б.Варфаламеева [і інш.]. – Мінск : Бел. Навука, 2001 – 2011. – Т. 2 : Віцебскае Падзвінне / Т.Б. Варфаламеева [і інш.]. – 2004. – 910 с.
25. Шарая, О. Западнополесский обряд Куст: социокультурные особенности и символика / О. Шарая // Гістарычная брама. – 2008. – № 1. – С. 81–93.


## SPECIFITY OF USING WILD PLANTS IN SPRING CALENDAR RITUALISM OF THE BELARUSIAN PEOPLE OF PODVINYE AT THE END OF XIX – XXI CENT.

*Y.KNUREVA*

*Wild plants have been an important element of calendar ritualism since ancient times. Beliefs concerning them have been formed during centuries and found their reflection in numerous rituals and customs of the spring calendar. The article analyzes traditional views of the people of Podvinye on wild plants in calendar ritualism of the annual cycle at the end of 19th-21th cent. On the basis of the author's field research and written sources the realization of common and local national views inVerbnica, Jurja,Troitsa rituals is characterized.*